Ангеліна САМАЛЁТАВА:

# «ТВОРЧАСЦЬ ЖЫВЕ Ў СЭРЦЫ КОЖНАГА ЧАЛАВЕКА»



Наша гераіня вучыцца на трэцім курсе ў БДУКМ, марыць пра вялікую сцэну і на сваім прыкладзе паказвае, як важна ісці за голасам сэрца, каб здзейсніць задуманае. Ангеліна Самалётава — таленавітая дзяўчына, якая рознабакова рэалізоўваецца і развіваецца. Іграе на фартэпіяна, спявае, малюе і добра валодае англійскай мовай. Пазнаёміліся мы з ёй на фестывалі «Моладзь за Саюзную дзяржаву» ў Смаленску, дзе дзяўчына ў вакальным выпрабаванні атрымала званне лаўрэата і дыплом 1-й ступені. Гэта не першая яе перамога, таму пры сустрэчы пацікавіліся, як дасягаць жаданага, не баяцца рызыкаваць і заяўляць пра сябе.

***— Ангеліна, раскажы, як даўно займаешся вакалам і з чаго ўсё пачалося?***

— Насамрэч, музыка з ранняга дзяцінства прысутнічае ў маім жыцці. Мне заўсёды падабалася выступаць на розных мерапрыемствах як у дзіцячым садку, так і ў школе. Толькі гучала пытанне: «Хто будзе спяваць?» — я імгненна адгукалася.

Маё захапленне музыкай складана было не заўважыць, аднак у музычную школу мяне спачатку не ўзялі з-за ўзросту. І ў 9 гадоў маці з бабуляй прывялі ў вакальную студыю ў маім родным горадзе Светлагорску. Я наведвала яе да 11 класа, але паралельна ўсё ж паступіла ў музычную школу і скончыла яе па класе фартэпіяна.

***— Чаму вырашыла і пасля школы паступаць на спецыяльнасць, звязаную з музыкай? Ці падабаецца табе вучоба ў творчай навучальнай установе?***

— Першапачаткова план быў зусім іншы. Збіралася ісці ў МДЛУ і вывучаць замежныя мовы. Я вельмі добра здала ЦТ і іспыты, але ў апошні момант зразумела, што нешта не тое. Быццам гэта будзе не мой шлях і не мае жыццё. Літаральна ў апошні дзень забрала дакументы і перакінула іх у БДУКМ на спецыяльнасць «Эстрадна-джазавы вакал». Вырашыла пайсці за голасам сэрца, і, здаецца, усё атрымалася.

Ужо вучуся на трэцім курсе і магу сказаць дакладна: я вельмі рада, што паступіла менавіта ў гэты ўніверсітэт. Вучоба даецца лёгка. Вакол цудоўная атмасфера: усе вельмі добразычлівыя і творчыя. А яшчэ ў мяне склаўся сапраўдны «канэкт» з адным з педагогаў. Вельмі люблю свайго выкладчыка па вакале Таццяну Мікалаеўну Дробышаву, якая мяне ва ўсім падтрымлівае.

***— Як часта ўдзельнічаеш у конкурсах і чаму гэта важна для вакаліста?***

— У конкурсах і фестывалях як рэспубліканскага, так і міжнароднага ўзроўню я сапраўды ўдзельнічаю часта. Гэта і Нацыянальны фестываль беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне, і фестываль-конкурс «Залатая пчолка», і «Агонь маладзёжных талентаў», і шмат іншых. Лічу, што такія спаборніцтвы — важны досвед вакалісту, бо ты развіваешся, гледзячы на іншых людзей. Гэта не пра канкурэнцыю, а пра тое, каб для сябе адзначыць, што адметнага робяць таленавітыя людзі. Ды і наогул кожны конкурс — проста скарбніца новых цікавых знаёмстваў. А яшчэ мяне яны зараджаюць энергіяй і матывацыяй.

***(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)***

# «ТВОРЧАСЦЬ ЖЫВЕ У СЭРЦЫ КОЖНАГА ЧАЛАВЕКА»

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Што можаш сказаць аб фестывалі ў Смаленску? Ці чакала, што прывязеш у Беларусь перамогу?***

— На фестывалі мне ўсё спадабалася. Ужо месяц амаль мінуў, а я яшчэ пад моцным уражаннем. Там была вельмі дружная атмасфера. Помню, спявала на сцэне, а ад гледачоў адчувала проста неверагодную энергетыку і падтрымку. І журы на конкурсе было вельмі прафесійнае і тактоўнае. Наогул, я туды ехала з дзвюма асноўнымі мэтамі: паглядзець горад і абзавесціся новымі сябрамі. Лічу, усё паспяхова выканала.

Што датычыцца выступлення, то, вядома, перад выхадам на сцэну хваляванне прысутнічала. Мне здаецца, яно ёсць заўсёды нават у самых дасведчаных артыстаў. Менавіта гэтае пачуццё настройвае на патрэбны лад і дапамагае сканцэнтравацца. Наконт першага месца — гэта не было маёй самамэтай, але ў глыбіні душы вельмі хацелася, каб маё выступленне атрымала годную адзнаку. І ў выніку маем вельмі прыемны вынік, за які я ўдзячная ўсім, хто да гэтага мае дачыненне.




***— А на каго з артыстаў арыентуешся ў музыцы?***

— Папраўдзе, вылучыць аднаго самага-самага вельмі цяжка. Калі казаць пра беларускую эстраду, то мне падабаецца творчасць Ганны Благавай і голас Яўгена Курчыча, якія, дарэчы, былі ў журы Смаленскага фестывалю. Таксама мне вельмі блізкая творчасць Сяргея Лазарава і Паліны Гагарынай. А з замежных выканаўцаў люблю Адэль, Крысціну Агілеру і Evanescence.

***— Падзяліся сваімі прафесійнымі марамі: на якіх пляцоўках хацела б выступіць і ў якіх праектах паўдзельнічаць?***

— Прызнаюся, я мару прабіцца на вялікую сцэну і выступаць побач з сапраўднымі прафесіяналамі сваёй справы. Кагосьці палохае публічнасць і слава, а я, наадварот, хачу, каб мае песні слухалі і каб мяне пазнавалі на вуліцы. Аднак мары могуць так і застацца марамі, калі не прыкладаць адпаведных намаганняў. Таму стараюся крок за крокам набліжацца да іх. Раней я выконвала песні іншых артыстаў, цяпер жа працую над выпускам сваіх уласных кампазіцый. Натхняюся людзьмі і музыкай. У перспектыве хацелася б прадставіць Беларусь на «Славянскім базары» і паўдзельнічаць у тэлепраектах «Голас» і «Ну-ка, все вместе!».

***— Ты — прыклад таго, як важна чуць свой унутраны голас. Якую параду дала б маладым людзям, хто сумняваецца, ці варта звязваць сваё жыццё з творчасцю? Якімі рысамі характару ім трэба валодаць, каб адчуваць сябе на сваім месцы?***

— Я раю ніколі не сумнявацца ў сваіх сілах. Найперш верыць у сябе, і ўсё атрымаецца. Бо, калі вельмі чагосьці хочаш, заўсёды дасягнеш. Творчасць жыве ў сэрцы кожнага чалавека, але хтосьці для сябе гэта адкрыў, а хтосьці — не.

Каб адчуваць сябе на сваім месцы, не трэба мець нейкія пэўныя рысы характару. Але сапраўдны прафесіянал, чалавек з амбіцыямі павінен быць моцным і не баяцца няўдач. Трэба помніць, што будуць узлёты і падзенні, але варта, нягледзячы на ўсе ваганні, працягваць ісці да сваіх мар і мэт.

**Лізавета ГОЛАД.**
**Фота аўтара і з архіва гераіні.**